XXXIII Нядзеля звычайная

Аўтар: кс. Яраслаў Грынашкевіч
15.11.2015 01:00

З Евангелля св. Марка

Езус сказаў сваім вучням: “У тыя дні пасля таго ўціску зацьміцца сонца, і месяц не дасць святла свайго. І зоркі будуць падаць з неба, і сілы нябесныя пахіснуцца. Тады ўбачаць Сына Чалавечага, які будзе ісці на аблоках з вялікай сілай і ў славе. Ён пашле тады Анёлаў сваіх і збярэ выбраных сваіх ад чатырох вятроў, ад краю зямлі да краю неба. Вучыцеся на прыкладзе смакоўніцы: калі галінка яе становіцца ўжо мяккай і распускаецца лісце, ведаеце, што блізка лета. Так і вы, калі ўбачыце, што адбываецца гэта, ведайце, што блізка Ён, пры дзвярах. Сапраўды кажу вам: не міне пакаленне гэтае, пакуль не адбудзецца ўсё гэта. Неба і зямля прамінуць, а словы Мае не прамінуць. А пра дзень той або гадзіну ні анёлы ў небе, ні Сын, ніхто не ведае, а толькі Айцец”. †

Мк 13, 24–32

Чаканне здзяйснення надзеі

Евангелле вучыць нас мудрасці чакання. Гэтым яно нібы змяшчае нас паміж рэчаіснасцю і тым, што павінна адбыцца. Ці карысна для нас такое “вісенне” паміж рэальным жыццём і здзяйсненнем надзеі? Ці не рызыкуем мы такім чынам аддаленнем, уцёкамі ад штодзённага жыцця? Пан Езус, калі гаворыць аб натуральным рытме прыроды, не толькі нас супакойвае, але і звязвае з рэальным жыццём, якое, каб быць сапраўдным, павінна быць у нейкай ступені пагружана ў чаканне свайго канчатковага здзяйснення. А здзейсніцца яно ў момант, калі пачнецца стан вечнасці, калі мы дасягнём дасканаласці. Гэта будзе магчыма пры паўторным прыходзе Збаўцы – Сына Чалавечага на зямлю. Тады споўніцца кожнае жаданне, скончыцца ўсякае чаканне.

Для нашага часу характэрна, што мы ў значнай ступені згубілі гэтае асноўнае вымярэнне хрысціянскага чакання. Пры адначасовым, сталым нараканні на недасканаласці нашага існавання. Парадаксальна – чым больш мы лічым навакольны свет нашым апошнім прызначэннем, чым больш мы з ім злучаемся, з тым большай цяжкасцю нам прыйдзецца змірыцца з праўдай аб мінучай рэчаіснасці, аб абавязковасці песціць надзею на канчатковае яднанне з Богам. Евангелле ёсць і застанецца Добрай Навінай ажно да канчатковага здзяйснення нашага чакання.